УДК 94(476):331.108

І. А. Пушкін
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і фізічнай культуры ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій»,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(Рэспубліка Беларусь)

МЕРЫ ПА ПЕРААДОЛЕННЮ ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў АПОШНІЯ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ САВЕЦКАГА ЭТАПА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (1970–1991)

Раскрыты і прааналізаваны асноўныя эканамічныя і сацыяльныя праблемы, вырашэнне якіх залежала ад кадравага патэнцыялу працаўнікоў прамысловасці Беларусі. Зроблена выснова, што ў 1970–1991 гг. адміністрацыйныя меры і спробы эканамічнага стымулявання па вырашэнні праблем у прамысловасці БССР на апошнім этапе савецкага перыяду дзяржаўнасці мелі кароткачасовы эфект.

Эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці Савецкай Беларусі нічым не адрозніваліся ад агульнасаюзных. На працягу 1970–1980-х гг. асаблівых мер цэнтральных і рэгіянальных улад патрабавала вырашэнне шэрагу сацыяльна-эканамічных праблем, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на фарміраванне, змест і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР.

Адна з асноўных праблем — тэхнічная рэканструкцыя прамысловых прадпрыемстваў і вытворчасці. Значную ролю ў яе вырашэнні адыграла тэхнічная творчасць рабочых і спецыялістаў, дзейнасць вынаходнікаў і рацыяналізатараў. На прадпрыемствах дзейнічала «Палажэнне аб матэрыяльным заахвочванні экспертаў, тэхінфарматараў, рабочых, ІТР і служачых, якія прымалі актыўны ўдзел у падборы, вывучэнні і ўкараненні ў вытворчасць перадавога вопыту іншых прадпрыемстваў». Праводзіліся абласныя агляды-конкурсы на лепшае прадпрыемства па ўкараненні вынаходстваў, рацыяналізатарскіх прапаноў і запазычаных новаўвядзенняў. Як вынік, толькі за 1974–1975 гг. у Гомельскай вобласці ўнеслі больш за 21 000 рацпрапаноў, якія былі накіраваны на паляпшэнне арганізацыі працы і вытворчасці [1, арк. 161]. У Віцебскай вобласці за 1971–1974 гг. рацыяналізатарамі Оршы і Барані было пададзена і ўкаранёна 12 618 рацпрапаноў [2, арк. 18]. За 1976–1980 гг. у народнай гаспадарцы Мінскай вобласці выкарысталі каля 240 000 вынаходстваў і рацпрапаноў [3, арк. 21]. У 1985 г. 176 000 працоўных, інжынераў, навуковых і іншых катэгорый працаўнікоў прымалі ўдзел у вынаходніцкай і рацыяналізатарскай

працы. У эканоміцы БССР было выкарыстана 144 000 рацпрапаноў і вынаходстваў [4, арк. 186].

Праблемы тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемстваў краіны былі абмеркаваны на нарадзе ў ЦК КПСС 11 чэрвеня 1985 г. Яе вынікі разгледзеў партыйна-гаспадарчы актыў БССР, які зацвердзіў мерапрыемствы па паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Сярод іншага прадугледжвалася актывізацыя тэхнічнай творчасці працоўных. Рэалізаваць гэта ў БССР у поўным аб'ёме не атрымалася. У 1986 г. кожная шостая рацпрапанова не знаходзіла прымянення. Больш за палову вынаходстваў праходзілі ўкараненне ў тэрмін ад трох да дзесяці гадоў [5, с. 397, 546; 6].

Праблема працоўнай дысцыпліны ў індустрыяльным комплексе Беларусі пачала абвастрацца з пачатку 1970-х гг. Так, у 1970 г. на прадпрыемствах г. Оршы здзейснілі прагул 1 619 чалавек (6 304 чалавека-дні) або ў 2,4 раза больш, чым у 1969 г. Толькі на Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе ў 1971 г. мела месца 752 чалавека-дні прагулаў. За 1974 г. на прамысловых прадпрыемствах г. Оршы страты працоўнага часу за год склалі 24 733 чалавека-дні. Гэта суразмерна таму, што больш за 100 чалавек не працавалі на працягу ўсяго года [7, с. 239; 8]. У 1987 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці страты працоўнага часу з-за прагулаў склалі 673 чалавека-дні, у 1988 г. — 777 чалавека-дзён, адбылося павелічэнне колькасці прагулаў на 15,5 % [9, арк. 54].

Партыйна-савецкае кіраўніцтва звязвала парушэнні працоўнай дысцыпліны з недастатковым выкарыстаннем усяго арсенала выхаваўчых сродкаў. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў пастанове ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС «Аб далейшым умацаванні працоўнай дысцыпліны і скарачэнні цякучасці кадраў у народнай гаспадарцы» (1979). У першай палове 1980 г. прайшоў грамадскі агляд выкарыстання рабочага часу ў БССР. У рэспубліцы разгарнулася індывідуальная работа з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. У 1981 г. яе праводзілі каля 26 000 чалавек партыйнага і прафсаюзнага актыву. У ліпені 1983 г. з'явілася чарговая пастанова ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС «Аб узмацненні работы па падняцці сацыялістычнай дысцыпліны працы» [5, с. 391–393].

На вытворчасць істотны ўплыў аказвалі ўмовы працы. Вельмі марудна адбываўся працэс пераходу ад ручнай да механізаванай працы. У 1977 г. удзельная вага работнікаў прамысловасці БССР, занятых ручной працай, дасягала 37,8 % ад усяго вытворчага персаналу. На шэрагу прадпрыемстваў Брэста, Бабруйска, Гомеля, Оршы, Маладзечна, Барысава ручная праца складала ад 43 да 49 % [10, с. 386–387]. Рэканструкцыя прадпрыемстваў з укараненнем новых прагрэсіўных тэхналогій і абсталявання, якія забяспечвалі здаровыя і

бяспечныя ўмовы працы, ажыццяўлялася вельмі павольнымі тэмпамі. У 1985 г. у прамысловасці БССР ручной працай быў заняты амаль кожны трэці рабочы [5, с. 395–396; 10, с. 402].

Крадзяжы і злоўжыванні ўладай закранулі практычна ўсе сферы эканомікі. Каб паменшыць ўзровень злачыннасці на прамысловых прадпрыемствах, прыкладалія намаганні як з боку ўладных структур, так і кіраўніцтва прамысловых прадпрыемстваў [11]. За 9 месяцаў 1971 г. у Гродзенскай вобласці выключылі з КПСС 143 чалавекі (77,3 %) за злоўжыванне службовым становішчам, крадзяжы і растраты, маральна-бытавое разлажэнне, п'янства, хуліганства, парушэнні дысцыпліны [12, арк. 109]. За 9 месяцаў 1976 г. у Віцебскай вобласці праваахоўнымі структурамі было ўзбуджана 294 справы супраць раскрадальнікаў дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, прыцягнулі да адказнасці 1 147 чалавек [13, с. 55–57].

Мясцовыя органы КПБ і савецкай улады прымалі пастановы і планы мерапрыемстваў па ўзмацненні барацьбы з крадзяжамі, у якіх патрабавалі, сярод іншага, павышаць адказнасць кіраўнікоў за падбор кадраў. За 1976–1979 гг. у Магілёўскай вобласці да партыйнай адказнасці прыцягваліся 85 (36,5 %) з 233 дарэктараў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў за пралікі ў кадравай працы. Але прынятыя меры мелі кароткачасовы поспех. У 1981 г. за здзяйсненне крадзяжу прадукцыі на ВА «Бабруйскшына» да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 63 чалавекі з ліку работнікаў аб'яднання, у 1982 г. — 50 чалавек, у 1983 г. — 68 чалавек. Сярод прыцягнутых да крымінальнай адказнасці было 15 кіраўніцкіх работнікаў і службовых асоб аб'яднання [7, с. 247; 10]. У сувязі з пагаршэннем сітуацыі са злачыннасцю ў другой палове 1980-х гг. ВС СССР 4 жніўня 1989 г. прыняў пастанову «Аб рашучым узмацненні барацьбы са злачыннасцю». Быў створаны Часовы камітэт па барацьбе са злачыннасцю ў СССР. Адпаведныя камітэты ствараліся ў абласцях і гарадах БССР [14, арк. 562–565].

У пачатку 1970-х гг. ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб мерах па ўзмацненні барацьбы супраць п'янства і алкагалізму». Органы ўлады, кіраўніцтва прадпрыемстваў і грамадскія арганізацыі выкарыстоўвалі розныя шляхі і метады барацьбы з паўсюдным п'янствам. За 1970–1971 гг. з членаў КПСС у Магілёўскай вобласці было выключана 489 чалавек, з іх 209 (42,7 %) — за п'янства [15, с. 201]. У Віцебскай вобласці за 1975 г. і дзевяць месяцаў 1976 г. прыцягнулі да адказнасці за п'янства 13 054 чалавекі [13, арк. 54]. Паступова, на кароткі час, памяншалася колькасць злачынстваў і дробных хуліганстваў, здзейсненых у п'яным стане, але праблема не вырашалася. Чарговым крокам па выкараненні гэтага сацыяльнага зла павінна была стаць пастанова ЦК КПСС ад 7 мая 1985 г. «Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму»

[5, с. 548]. Праз месяц адпаведную пастанову прыняў СМ БССР. У Беларусі вытворчасць лікёра-гарэлачнай і вінаробнай прадукцыі скарацілася, але п'янства на працоўных месцах істотна не змяншалася. У ходзе правядзення ў жніўні 1988 г. рэспубліканскага рэйду практычна на кожным другім з праверaных 3,6 тысячы прадпрыемстваў і арганізацый БССР былі выяўлены парушэнні антыалкагольнага заканадаўства [16, арк. 199].

Рабіліся спробы выкарыстоўвання метадаў эканамічнага стымулявання. У пачатку 1970-х гг. на Волжскім аўтамабільным заводзе пачаўся эксперымент па ажыццяўленні брыгаднай формы арганізацыі працы. У БССР аднымі з першых новую форму арганізацыі працы пачалі асвойваць калектывы аб'яднанняў «Гомсельмаш» (Гомель), «Палімір» (Наваполацк) і інш. Да 1986 г. у прамысловасці рэспублікі колькасць працаўнікоў, занятых у брыгадах, складала 78,3 % [5, с. 388–390]. Пераход на брыгадную арганізацыю працы спрыяў значнаму паляпшэнню гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў. У 1983 г. у парадку эксперыменту вытворчым аб'яднанням (прадпрыемствам) далі больш шырокія правы ў планаванні і гаспадарчай дзейнасці, што павінна было спрыяць павышэнню іх зацікаўленасці ў высокапрадукцыйнай працы, паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу [17, с. 446]. Але метады эканамічнага стымулявання былі часовымі і супярэчылі абвешчаным мэтам і прынцыпам пабудовы сацыялістычнага грамадства. Эканамічныя меры насілі незавершаны характар і марудна ўкараняліся на вытворчасці, у прыватнасці, брыгадны і арэндны падрады.

Асноўнымі эканамічнымі і сацыяльнымі праблемамі ў прамысловасці, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на фарміраванне, змест і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР, з'яўляліся неўкамплектаванасць прадпрыемстваў кадрамі, тэхнічная рэканструкцыя прадпрыемстваў, парушэнні працоўнай дысцыпліны, злоўжыванні ўладаю і алкагольнымі напоямі, якасць прадукцыі і рытмічнае забеспячэнне насельніцтва таварамі і інш. Сітуацыя не мянялася на працягу дзесяцігоддзяў. Партыйна-савецкае і гаспадарчае кіраўніцтва БССР спрабавала вырашыць праблемы ў асноўным за кошт прыняцця адміністрацыйных мер. Спробы эканамічнага стымулявання не давалі чаканага выніку з-за існаваўшых ідэалагічных абмежаванняў і сістэмы размеркавання, адсутнасці шырокага выбару сацыяльных даброт і прадметаў шырокага спажывання. Вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы ў прамысловасці Беларусі стала магчымым толькі ў перыяд станаўлення і развіцця прэзідэнцкай формы кіравання.

1. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Вярнуцца да артыкула

2. Занальны дзяржаўны архіў г. Орша. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Вярнуцца да артыкула

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4 п. Воп. 142. Спр. 61. Вярнуцца да артыкула

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 7. Воп. 10. Спр. 294. Вярнуцца да артыкула

5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Мінск : Соврем. школа : Экоперспектива, 2007–2011. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). 2011. 728 с. Вярнуцца да артыкула

6. Пушкін І. А. Удзел кадраў прамысловасці ў паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі савецкага этапа дзяржаўнасці (1970–1990 гг.) // Вестн. Белорус. гос. ун-та пищевых и хим. технологий. 2024. № 2. С. 80–88. Вярнуцца да артыкула

7. Пушкін І. А., Агееў А. Р. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. Магілёў : БДУТ, 2022. 302 с. Вярнуцца да артыкула

8. Пушкін І. А. Грамадскасць ў барацьбе са злачыннасцю і за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны сярод работнікаў прамысловасці БССР у 1970–1980-я гг. // Правовая культура в современном обществе : сб. науч. ст. / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» ; редкол.: И. А. Демидова (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2024. С. 339–344. Вярнуцца да артыкула

9. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / А. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі, У. А. Палуян ; Ін-т гісторыі АНБ. Мінск : Беларусь, 1995. Ч. 2. 560 с. Вярнуцца да артыкула

10. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Вярнуцца да артыкула

11. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Мінск : Беларус. навука, 2011–2012. Кн. 2. / М. У. Смяховіч, А. А. Каваленя, В. В. Данілович [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. 2012. 654 с. Вярнуцца да артыкула

12. Пушкин И. А. Неправомерные действия и злоупотребления служебным положением в советский период модернизации Беларуси, 1970–1991 гг. // Советский опыт: взгляд из XXI века (к 100-летию образования СССР) : сб. ст. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. М. : Фонд «Историческая память», 2023. С. 328–345. Вярнуцца да артыкула

13. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 978. Вярнуцца да артыкула

14. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Вярнуцца да артыкула

15. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3861. Вярнуцца да артыкула

16. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Вярнуцца да артыкула

17. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784. Вярнуцца да артыкула

I. A. Pushkin

Measures to overcome economic and social problems of Belarusian industry in the last decades of the Soviet stage of statehood (1970–1991)

The main economic and social problems, the solution of which depended on the human resources of the Belarusian industry, are revealed and analyzed. It is concluded that in 1970–1991, administrative measures and attempts to economically stimulate the solution of problems in the BSSR industry at the last stage of Soviet statehood had a short-term effect.